# Сёння, 1 лютага, у Мінскай гарадской ратушы адбылася прэзентацыя паштовага праекта, прысвечанага II Еўрапейскім гульням 2019 года

У цырымоніі ўрачыстага гашэння паштовых марак прынялі ўдзел:

першы намеснік Міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь **Дзмітрый Генадзевіч Шэдко;**

намеснік Міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь **Аляксандр Іванавіч Бараўля;**

дырэктар фонда «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» **Георгій Васільевіч Катулін.**

На марках прадстаўленыя адны з самых папулярных і відовішчных відаў спорту, якія ўваходзяць таксама ў праграму наступых Алімпійскіх гульняў у Токіо. Колеравая гама марак спалучаецца з сімволікай II Еўрапейскіх гульняў: лагатыпам і слоганам - «Яскравы год, яркі ты». Яркі паштовы праект падорыць не менш яркія эмоцыі!

У час мерапрыемства талісман II Еўрапейскіх гульняў 2019 года Лісяня Лёсік адправіў першыя паштоўкі-запрашэньні ў нацыянальныя алімпійскія камітэты з новенькімі маркамі.

На другім паверсе госці маглі азнаёміцца са спецыялізаванай выставай паштовай прадукцыі, прысвечанай выключна спартыўнай тэматыцы.

---

**Source URL:** *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/01-02-2019-4027*